апісвае” [5]. А. Брава не прыйшлося змяняць сваё жыццё, яна проста занатавала некалі пражытае, што цалкам адпавядае патрабаванням жанру нон-фікшн.

### Літаратура


1. Алена Валер’еўна Брава [Электронны рэсурс] // Вікіпедыя. – Рэжым доступу: https://be.wikipedia.org/wiki. – Дата доступу: 01.03.2019.
2. Брава, А. Каменданцкі час для ластавак : аповесць [Электронны рэсурс] / А. Брава // Kamunikat.org: Беларуская Інтэрнэт-Бібліятэка. – Рэжым доступу: http://kamunikat.org/8643.html?pubid=11259&lang=PL. – Дата доступу: 01.03.2019.
3. Алена Брава “Каменданцкі час для ластавак (сборник)” – рецензия [Электронный ресурс] // LivLib: Книжный портал с персональными рекомендациями и личными коллекциями. – Режим доступа: https://www.livelib.ru/review/859411-kamendantski-chas-dlya-lastavak-sbornik-alena-brava. – Дата доступа: 01.03.2019.
4. Браво, Е. Диалог со временем : интервью-послесловие [Электронный ресурс] / А. Браво // Prastora.by. – Режим доступа: http://prastora.by/knihi/brava-aliena-daravannie. – Дата доступа: 01.03.2019.
5. Новиков, А. Что такое “нон-фикшн”? [Электронный ресурс] / А. Новиков // ЛитКритика.by: Белорусский литературный портал. – Режим доступа: https://litkritika.by/categories/literatura/raznoe/2161.html. – Дата доступа: 01.03.2019.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Маральна-этычныя праблемы ў творах Івана Шамякіна пра сучаснасць (на матэрыяле аповесці “Драма”)

*Х. Л. Сузінь*
*БДПУ (Мінск)*
*Навук. кіраўн. – І. М. Гоўзіч, канд. філалаг. навук, дац.*

**Анатацыя.** На матэрыяле аповесці І. Шамякіна “Драма” разглядаюцца маральна-этычныя праблемы, якія закраналіся ў беларускай літаратуры мяжы XX–XXI стагоддзяў, звяртаецца ўвага на эвалюцыю вобраза жанчыны.

**Ключавыя словы:** маральна-этычныя праблемы; перабудова; феміністычны дыскурс; маральны канфлікт.

Беларуская літаратура мяжы XX–XXI стагоддзяў надзвычай чуйна рэагавала на змены ў грамадска-палітычнай сітуацыі і свядомасці людзей савецкага перыяду, звярталася да асэнсавання праблем сучаснасці, якія выклікалі непрыманне і крытыку

адных пісьменнікаў і больш-менш станоўчую ацэнку другіх. Менавіта да першага кірунку належаў Іван Шамякін, у творчасці якога “выяўлялася цікавасць да вобразна-выяўленчых магчымасцей разнастайных мастацкіх сістэм, “тэхнік пісьма”, выразна акрэслівалася тэндэнцыя да пераасэнсавання сутнасці і функцыі мастацкай умоўнасці” [4, с. 10].

Віктар Каваленка так сказаў пра творчасць І. Шамякіна гэтага перыяду: “Ён нашмат узбагаціў мастацка-выяўленчыя магчымасці беларускай прозы, накіраваўшы асноўную сілу свайго таленту на даследаванне сучаснасці. Сучаснасць у творах І. Шамякіна – гэта поле напружанага супрацьдзеяння спрадвечных катэгорый чалавечага быцця: духоўнасці і бездухоўнасці, шчырасці і двурушнасці, сумленнасці і маральнай нявытрыманасці, смеласці і баязлівасці” [2, с. 230].

Пісьменнік, які заўсёды чуйна адчуваў пульс часу, звяртаючыся да самых надзённых праблем рэчаіснасці, стаў у літаратуры першаадкрывальнікам многіх новых тэм: тэмы партыйнай інтэлігенцыі з галоўным героем – жанчынай, тэмы герояў-інтэлігентаў у час перабудовы грамадства, тэмы маральнага падзення асобных людзей і дзяржавы, лёсу мнагадзетных сямей і інш.

Грунтуючыся на праўдзе жыцця, добра адчуваючы яго глыбінны ход і магчымыя павароты, І. Шамякін завастрыў сюжэтныя канфлікты, паказаў напружанасць, дыялектычную супярэчлівасць грамадскага развіцця, вывеў напаверх маральны, духоўны сэнс. Героям твораў пісьменніка апошніх гадоў уласціва працоўная апантанасць: захапленне любімай справай робіць іх яшчэ больш адчувальнымі да самых надзённых праблем грамадскага жыцця, бо праз уласную працу яны ўступаюць у шырэйшыя ўзаемаадносіны з людзьмі і здольныя асэнсаваць гэтыя ўзаемаадносіны. У пераадоленні цяжкасцей, у барацьбе з адмоўнымі з’явамі навакольнай рэчаіснасці адбываецца далейшае іх унутранае, духоўнае сталенне [1].

Паглыбленым аналітычным зместам пазначана аповесць І. Шамякіна “Драма” (1988) – яркі мастацкі твор часу перабудовы пра ломку псіхалогіі людзей ва ўмовах дэмакратыі і галоснасці. І. Шамякін выявіў сучаснасць праз даследаванне чалавечых характараў у іх складанасці, раскрыў маральную філасофію паводзінаў, адносінаў да рэчаіснасці. У аснову твора пакладзены незвычайны сацыяльны і духоўна-маральны канфлікт: ператварэнне савецкай жанчыны-функцыянера ў звычайную жанчыну.

Алла Уладзіславаўна Наліцкая – трыццацішасцігадовая адзінокая жанчына, якая была прызначана сакратаром гаркама. Гэта “*сярэдняга росту, стройная – “што маладая сасонка”, элегантная, з густам адзетая, модна прычасаная*” [3, с. 177]. Галоўная мэта яе жыцця заключалася ў тым, каб зрабіць кар’еру. Яе прабіўны характар, уменне працаваць з людзьмі дапамаглі ёй дамагчыся вялікай пасады. Яна была не проста самакрытычнай, у меру ганарлівай, духоўна багатай жанчынай, а жанчынай-функцыянерам – партыйным, а раней камсамольскім

РЭПОЗІТОРЫЙ БДПУ

кіраўніком, які заўсёды стаяў на чале яе масы. Па меркаванні Ліхача, аднакурсніка Алы Уладзіславаўны, яе задавальняла толькі адно: “*Каб усе маршыравалі. І сама таксама. Але каб яна наперадзе. І з шабляй на плячы*” [3, с. 254]. Дзеля гэтага жанчына ахвяравала ўсім: каханнем, маладосцю, сям’ёй. Калі Наліцкая дасягнула высокай пасады, узначаліла гарадскі партыйны камітэт, то пачала трацiць ранейшую ўпэўненасць, цвёрдасць, непахіснасць у вырашэнні глабальных пытанняў жыцця іншых людзей. Ёй ужо хочацца асабістага шчасця: быць каханай, стаць маці.

Унутраны спакой Наліцкай і яе ўпэўненасць у сабе парушыла не перабудова, што неўзабаве пачалася ў дзяржаве, а сустрэча з Ліхачом, да якога яна ў студэнцкія гады мела пачуццё закаханасці. Дырэктар завода Васіль Васільевіч Ліхач, нечакана абраны на гэтую пасаду дэмакратычным шляхам, спаўна зведаў цяжар перабудовачных крокаў, сутыкнуўся з сілай інерцыі, засіллем каманднa-адміністрацыйнай сістэмы, чарговай дэмагогіяй. Ліхач адчуў магчымасць працаваць і жыць па-новаму, таму ён дзейсны, смелы, рызыкоўны, часам катэгарычны і настойлівы ў дасягненні мэты. Менавіта гэты індывідуальны стрыжань ў характары Ліхача прыцягваў Наліцкую. З гэтай фатальнай сустрэчы і пачынаецца “падзенне” Наліцкай-партыйнага кіраўніка да Наліцкай-простай жанчыны. Працэс падзення адлюстроўваецца з аўтарскім гумарам: “*І ў яе – о, слабы пол! Часам з’яўляліся зусім бабскія думкі! Але яна праганяла іх: не на кухні і не ў пялёнках яе прызванне*” [3, с. 184], падкрэсліваецца іроніяй: “*Часцей – сорам! – яна замірала ад цеплыні яго рукі*” [3, с. 185].

Запаланіўшыя душу і сэрца ўспаміны пачалі рабіць з першым сакратаром гаркама Алай Уладзіславаўнай нешта неверагоднае і не ўласцівае ёй: начамі яе пачалі даймаць сны, у якіх яна забаўляла дзіця, хлопчыка, “*падкідвала яго <...> лавіла, цалавала яго ножкі, хлопчык заліваўся смехам і яна таксама рагатала*” [3, с. 223]. Пасля гэтых сноў і думак Алу Уладзіславаўну пацягнула ў радзільны дом. Жанчын, якія кармілі дзяцей, яна лічыла “*мадоннамі, ад якія пахла малаком*” [3, с. 226]. Думкі пра дзіця і ўвогуле пра жаночае шчасце яе не пакідалі. У выніку ўсяго гэтага, пасля “*пакутлівых, саромных, нявінных і скаромных развважанняў Ала Уладзіславаўна пераканала сябе: трэба нарадзіць*” [3, с. 227], а “*перад вачамі стаяў адзін. Куды б ні плылі думкі, круг іх замыкаўся на ім. Толькі яму магла б сказаць <…> У пэўных умовах: «Вася, я хачу дзіця… ад цябе»*” [3, с. 229]. Ліхач адпавядаў ідэалу мужчыны, які склаўся ва ўяўленні адзінокай жанчыны. І невядома, чаму так адбывалася. Можа быць з-за іх ранейшай сувязі, а можа быць таму, што Наліцкай надакучыла быць моцнай і адзінокай жанчынай.

Але думаць пра каханне – нешта недасягальнае для свядомасці партыйнага сакратара. Наліцкую палохала думка, што на некаторы час прыйдзецца перапыніць работу. А за гэты час там, уверсе, могуць падумаць: жанчына з малым дзіцём – не



РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

той “першы” ў напружаны час перабудовы. Яе жаданне зыходзіць з фізіялагічнай патрэбы, у чым і бачыць аўтар драму савецкай жанчыны-функцыянера, праца якой пазбавіла яе адвечна жаночага – кахання і мацярынства. Паступова сакратар гаркама, выпеставаная і незалежная ў сваіх жаданнях, “*ператвараецца з афіцыйнай асобы ў... бабу, у звычайную бабу*” [3, с. 242], але і “звычайнай бабы” з яе не атрымліваецца, таму што Наліцкая-функцыянер ужо не можа прынізіцца да ўзроўню “проста жанчыны”, страціла за час працы такую здольнасць.

Такім чынам, у аповесці “Драма” І. Шамякін звяртаецца да тэмы партыйнай інтэлігенцыі. Адметнасць твора ў тым, што галоўным аб’ектам мастацкага даследаваннем становіцца псіхалогія і харaство жанчыны. У сваіх ранейшых творах І. Шамякін стварыў шэраг станоўчых вобразаў жанчын, галоўная ж гераіня аповесці “Драма” Ала Наліцкая зусім не адпавядае пазначанаму раней пісьменнікам ідэалу. Сёння жанчыны выступаюць за раўнапраўе жанчын і мужчын. Усё часцей хочуць быць партнёрамі мужчын, не саступаць ім ні па сіле, ні па магчымасцях мець такія самыя правы, свабоды і абавязкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

## Літаратура


1. Каваленка, В. Іван Шамякін : нарыс жыцця і творчасці / В. Каваленка. – Мінск : Нар. асвета, 1980. – 207 с.
2. Марціновіч, А. “З цэлым народам гутарку весці...” / А. Марціновіч // Полымя. – 2001. – №1. – С. 230–243.
3. Шамякін, І. Драма : аповесці, гіст. сцэны / І. Шамякін. – Мінск : Маст. літ., 1990. – 334 с.
4. Шаўлякова-Барзенка, І. Л. Проза / І. Л. Шаўлякова-Барзенка // Гісторыя беларускай літаратуры XX стагоддзя : у 4 т. / НАН Беларусі, Аддз-не гуманітар. навук і мастацтваў, Цэнтр даслед. Беларус. культуры, мовы і літ. ; навук рэд. У. В. Гніламёдаў, С. С. Лаўшук. – 2-е выд. – Мінск : Беларус. навука, 1999–2014. – Т. 4, кн. 3.– 2015– С. 8–35.